Данута Бічэль

# Нараджэнне Езуса Хрыста, нашага Збаўцы

Вершаваная батлейка

www.kamunikat.org

Мінск
Выдавецтва «Про Хрысто»
2005

**Дзейныя асобы:**

Марыя, Маці Божая
Святы Юзаф
Нованароджаны Езус, Сын Божы
Тры Каралі —
Каспар, Мельхіёр, Бальтазар
Перапісчык і Летапісец — *вядучыя*
1-ы Анёл і 2-і Анёл
*(іх могуць замяніць Перапісчык і Летапісец, прымацаваўшы крылцы).*
Анёл Панскі і хор Анёлаў з неба
1-ы Пастушок, 2-і Пастушок
і малы пастушок Мізінчык
Гэрад, кароль Юдэі
Міністр замежных спраў
Вучоны
Зоркі, вырай зорак
Калядная (Бэтлеемская, Цудоўная Зорка)
Голас з неба і голас з-за сцэны
Волік, Вослік і Авечкі *(іх іграюць дзеці)*
Коцік
1-я Мышка, 2-я Мышка

www.kamunikat.org

## У Бэтлееме. Дзея І.

*Песню спявае капэла, але кожную страфу паўтарае ўся зала.*

**Шчаслівая навіна**

Шчаслівая навіна
прыляцела рана:
нарадзіла Бога-Сына
нам Святая Панна.

А дзе ж тое Дзіцятка?
Ціха спіць на сене.
Святое Немаўлятка
нам на адкупленне.

Пакланіцца Пану Богу
прыбываюць Трое.
Зорка ведае дарогу.
Спіць Дзіця Святое.

О, нябесны квет Лілея,
найяснейшы самы!
Спіць у яслях у Бэтлееме
каля Святой Мамы.

З'ява перад стаенкай

Летапісец і Перапісчык.

Летапісец *чытае з доўгага скрутку:*
Аўгуст Актавій, манарха магутны,
выдаў такі тэрміновы загад:
Перапісацца ўсім абсалютна —
над непакорнымі трэба нагляд!

Перапісчык *жартам:*

І над пакорнымі трэба нагляд!
Л е т а п і с е ц *чытае:*
Дзе цябе продак спавіў і ў калыску,
там ты з'яўляешся на перапіску!

П е р а п і с ч ы к *жартам:*
Вось і не будзе ў імперыі страт
Будзе ў імперыі лад! — Гэта жарт!

З'ява не ў стаенцы

Ю з а ф, М а р ы я і д в а а н ё л ы.

1-ы Анёл:
Моцнае мужнае сэрца Марыі
Сэрца Марыі лечаць малітвы.

2-і А н ё л:
Юзаф Святы быў нашчадкам Давіда
Ён да Марыі звяртаецца так:

Ю з а ф:
Продку Давіду належаў Бэтлеем.
На перапіску туды мы паспеем.
Будзем спыняцца — і не самлеем.
Возьмем з крынічнай вадзіцаю гляк.

З'ява не ў стаенцы

Л е т а п і с е ц і П е р а п і с ч ы к.

Л е т а п і с е ц:
Там, у Бэтлеем, заезд быў багаты.
Як у гатэлі, усе месцы заняты.

П е р а п і с ч ы к *(гаворыць жартам):*
На перапіску ідуць, як на баль,

п'юць, весяляцца — багатыя скнары!
Нават купляюць дамы за дынары.
Болей гасцей, чым на возеры хваль!

З'ява ў стаенцы

Ю з а ф , М а р ы я , Д з і ц я т к а Е з у с і д в а А н ё л ы .

*Размаўляюць два анёлы:*

1-ы А н ё л:
Цемра Святую Сям'ю напаткала.
У Юзафа-цеслі «асаў» замала.

2-і А н ё л:
Іхнія «асы», як нашы «рублі».

1-ы А н ё л:
Час наступае Дзіцятку радзіцца,
а не знайшлося месца ў святліцы.

2-і А н ё л:
У цёплай стаенцы месца знайшлі.

*У стаенцы запальваецца святло,*

А н ё л ы *кажуць разам:*
Езус на свет нарадзіўся ў стаенцы.
Маці Яго спаць паклала на сенцы.

М а р ы я *Сына спавівае, кладзе ў яслі і спявае:*
Спі, Найцудоўнейшы Жомчуг Нябёс!
Спі, Мой Званочак, Квеце мой польны.
Вырасцеш дужы, вырасцеш здольны.
Бог, наш Айцец, Табе вызначыў лёс.

Ю з а ф *кленчыць перад Дзіцем:*
Перад Табою, Сыне наш, кленчу.

Маю шляхотныя рукі і плечы.
Што Табе дам? Ахвярую любоў!
Я прывучу Цябе, Сыне, да працы,
Будзеш мне дошкі стругаць на сталярцы,
Будзем трымацца, як двое сяброў!

Усе прысутныя *ціха спяваюць:*
Дрэва Сям'і з трох атожыл-галін:
Юзаф, Марыя і Божы Сын.
Езус — Марыя — Божы Дуэт
Божы Дуэт і ён збавіў свет.

*(Можна таксама праспяваць такую простую песню — «Стаенка»):*

Сэрца Юдэі — стаенка малая
праўды мяняе, веру ўзмацняе.

Сэрца Юдэі — жывая істота,
ды разумее смутак сіротаў.

Месца для раю Бог выбірае
Езус, Сын Божы, рай адчыняе.

**Калыханка Маці Божай:**

Спі, Мілы Сейбіт,
Любоў — Тваё зерне.
Выспее плён —
стрэлкі часу паверне.

Узыйдзе дабром
Міласэрнае Сэрца.
Нітачка веры
не перарвецца.

Пойдзе да новых
сусветаў зямліца.

Езус Мой Сонейкам
будзе свяціцца.

Богам пачута
Матчына болесць.
Дапамагу Табе
смерць перадолець!

Спі, Мой Маленькі
ад Духа Святога!
Спі, Адкупіцель
роду людскога!

**Каля вогнішча. Дзея II.**

**З'ява**

*У небе спяваюць* З о р к і.

З о р к і:
— Дзін, дзін, дзін!
— Колькі цяпер гадзін?
— Поўнач, 12 гадзін!
— А чаму гэтак неба святлее?
— Гэта новае неба над Новым Бэтлеем!

З'ява

*Каля вогнішча* — П а с т у ш к і, А н ё л П а н с к і, Л е т а п і с е ц і П е р а п і с ч ы к, А в е ч а ч к і *тут, недалёка.*

Л е т а п і с е ц:
Пасвілі дзеці ў полі авечак.
Корчык смылеў патрэскваў агеньчык.

1-ы П а с т у ш о к:
Так можна статак праспаць ля агню.

Давайце згуляем у нашу гульню!

*Лічылка:*
Сыкамара, Вавілон!
Эны, бэны, выйдзі вон!

*Выходзіць другі. Далей лічылка:*
За гарою воўк не спіць!
Ты, Малы, табе вадзіць!

М і з і н ч ы к *бярэ кій, ходзіць каля агню:*
Куцу, куцу, авечачкі!
Недалёка рэчачкі.
Воўк за гарою,
я — за другою.
Ваўка не баюся,
кіем баранюся.
Паламаўся мой кіёк,
воўк з баранчыкам уцёк.

*У роспачы ідзе шукаць. Прыгаворвае:*
Тут след, тут нара,
іду да воўчага двара.

*Пытае ў 1-га Пастушка:*
Баба, баба, ці бачыла майго баранчыка?
— А які ён?
— Белы!
— Пабег па белай дарожцы...

*Стаміўся. Спіць, абапёрся на кіёк.*

П е р а п і с ч ы к :
З неба спусціўся да іх Анёл Панскі
у светлай кашулі агністага бляску

www.kamunikat.org

Летапісец:
Як пацямнеў апошні асмолак —
убачылі ўсе: перад імі — Анёлак.

Перапісчык:
Кажа Анёлак.

Анёл Панскі:
Цяпельца датлее.
Статак збярыце.
Спяшайце ў Бэтлеем.
Знойдзеце ў яслях
Дзіцятка на сене —
Бог наш прыслаў
Яго ўсім на збаўленне.

1-ы Пастушок:
Як Яго знойдзем?

2-і Пастушок:
Шукаць Яго дзе?

Анёл Панскі:
Зорка цудоўная вас павядзе!

З'ява
*Тыя самыя і* хор Анёлаў.

Анёл Панскі:
Вырай Анёлаў ляціць з паднябесся!
Чуецца ўсюды анёльская песня!

Хор Анёлаў:
Богу хвала на вышынях, а ў доле
радасць усім пастушкам добрай волі!
Збаўца людзей нарадзіўся ў Бэтлеем,
і называецца Эмануэлем!

Летапісец і Перапісчык:
Нехта закашляўся ў прысак гарачы:

Голас з неба:
Эмануэль — «з-намі-Бог» — гэта значыць!

Летапісец і Перапісчык *(апавядаюць, што адбываецца):*
Вырай Анёлаў узняўся высока.
Ноччу як ззяе на небе вясёлка.
Песня змаўкае — прыгожае дзіва...
Зорка Цудоўная змрок асвяціла.

Малы Пастушок:
Хвосцік у Зоркі, як у ваверкі,
аж заяснелі далочкі, пагоркі!

Зорка:
Я — Божы Знак, Бэтлеемская Зорка!
Новы Бэтлеем зусім недалёка!

Дзве зоркі:
—Дзін, дзін!
—У Бэтлеем ляцім!

## Дзея III. У Бэтлееме
## З'ява

Святая Сям'я, Пастушкі, ягняткі.

*Размова* Пастушкоў *перад стаенкай:*
— Бачыце, Зорка сядае на стрэшцы!
— Бачыце, светла ад Зоркі на сцежцы!
— Ззяннем атулены Збаўца Маленькі!
— Укленчым пабожна прад Ім на каленкі!
— Бачыце, укленчылі з намі ягняткі!

М і з і н ч ы к:
Нашы ягняткі яшчэ немаўляткі.

Я г н я т к і *бляюць:*
Мэ, мэ!

П а с т у ш к і *ўсміхаюцца і вітаюць Дзіця хорам:*
Хвала Богу на вышынях!
Сыну Божаму хвала!
Па узгорках, па далінах
зорка нас сюды вяла.

*Падводзяць ягнятак і аддаюць іх Святой Сям'і:*
Дорым Езусу на ножкі
З воўны цёплыя панчошкі...

**Гульня ў сароку**

П а с т у ш о к *лічыць пальчыкі на святой ручцы Езуса:*
Ляцела сарока
з Туніса ў Марока.
Наварыла кашкі,
раздала фісташкі.
Гэтаму дала, гэтаму дала,
гэтаму дала.

*Паварочваецца да* М і з і н ч ы к а *і паказвае на яго:*
А ты, Мізінчык, не дарос,
табе ветрык не натрос.
Табе арэшкаў няма!

М і з і н ч ы к *бярэ палачку, ходзіць туды-сюды перад яселькамі і кажа:*
Пайшоў Мізінчык у белы свет
так, каб вярнуцца на абед!

У с е р а з а м:
Пакуль тата з Ніла вадзіцу нёс,

Мізінчык падрос, арэшкаў натрос.

М і з і н ч ы к *высыпае арэшкі ў міску, ставіць перад Езусам.*

П а с т у ш к і *спяваюць Езусу песню:*
Нарадзіўся Бог-Месія,
пастушкі Яго знайшлі.
Хвала Богу на вышынях,
і спакой — на ўсёй зямлі.

Нас у статак Бог збірае,
атуляе ўсіх цяплом.
Нас любоў Яго яднае,
мы ад радасці пяём.

Спіць нявольная Юдэя,
а ў стаенцы Збаўца спіць.
Будзем пець мы, як умеем,
будзем Божаньку любіць.

*Святло прыглушаецца.*
П а с т у ш к і *пакідаюць Божае Дзіця, якое заснула. Пакідаюць пры ім ягнятак.*

З'ява без пастушкоў

Д в а  А н ё л ы *ў кутках шопкі,* С в я т а я  С я м'я, В о с л і к, В о л і к, А в е ч к і, К о ц і к, д з в е  М ы ш к і.

1-ы А н ё л:
Думае, думае Маці Марыя,
Маці Марыя даведацца хоча:

М а р ы я:
Што могуць значыць спевы такія?
Што нас чакае, Божа, наш Ойча?

Божа, хай станецца воля Твая!
Маю шчэ час — буду думаць пасля.

*Прылегла каля ясляў, дрэмле.*

1-ы А н ё л:
Дудачка грае, ночка святлее.
Адпачывае стамлёны Бэтлеем.

2-і А н ё л:
Волік і вослік дыхаюць цёпла.
Божаю ласкаю грэецца шопка.

1-ы А н ё л:
Мовай людзей кажа волік:

В о с л і к :
Ча-му-у
Я іх на спінку сабе не вазьму?

2 - і А н ё л :
Вослік за волікам кажа:

В о с л і к:
І-і-я!
Цёплая вельмі спінка мая!

1-ы А н ё л:
Коцік з-пад ночваў песню вуркоча:

К о ц і к:
Баінькі баю, Божы Сыночак!

1-ы А н ё л:
Шэрая мышка вылезла з норкі.

www.kamunikat.org

М ы ш к а:
Коцік заснуў, пабягу на вячоркі!

А н ё л:
Мышка другая ў першай пытае:

М ы ш к і *стаяць каля зэдліка, кожная насупраць адна адной.*

2-я М ы ш к а:
Мышка, Мышка, дзе была?

1-я М ы ш к а: У Малога Караля!

2-я М ы ш к а: Што рабіла?

1-я М ы ш ка: Хатку мыла!

2-я М ы ш к а: Што знайшла?

1-я М ы ш к а:
Сакрэт адзін:
Ён — Кароль і Божы Сын!

М ы ш к і *бегаюць і дражняцца.*

2-я М ы ш к а:
А мяне знайшлі ў капусце!

1-я М ы ш к а:
А Яго ў ахапку зёлак!

2-я М ы ш к а:
А мяне падкінуў буслік!

1-я М ы ш к а:
А Яго прынёс Анёлак!

## Палац Гэрада. Дзея IV.

З'ява перад палацам

Летапісец, Перапісчык, Голас з неба.

Летапісец:
Як нарадзіўся ў Бэтлееме Кароль,
Бог перадаў верным людзям пароль:
з хвосцікам Зорку на неба пусціў.
Даў Ёй заданне:

Голас з неба:
У Бэтлеем ляці!

Перапісчык:
Тры Мудрацы Каралямі былі.
Кожны, адзін, ва ўласнай зямлі.
Нельга абраць аж траіх каралёў
на каралеўства — пральюць яны кроў!

Летапісец:
Ехалі, ехалі, пешкі ішлі.
І на вярблюдах, і коней вялі.

Перапісчык:
Маглі заблудзіцца?

Летапісец:
Ды не, не маглі!
Зорка ў Бэтлеем вяла Каралёў
між непраходных лясоў і палёў!

Каралі *ў гэты час на далягядзе едуць сабе на драўляных коніках, на палачках.*



www.kamunikat.org

Перапісчык:
Траіх тая самая Зорка вяла?

Летапісец:
Так, бо высока на небе ўзышла!

Перапісчык:
А дзе тыя простыя людзі былі?

Летапісец:
Грашылі, сварыліся, войны вялі.

Разам:
Тры Каралі ўбачылі цуд —
Зорку, якой не было яшчэ тут.
Кінулі войска і смачны абед,
троны, кароны, пайшлі ў белы свет.

З'ява ў палацы

Гэрад, Міністр, вучоны, Тры Каралі, голас з-за шопкі.

Гэрад:
Ляжу і плюю ў сваю столь!
Я — Гэрад, вялікі кароль
ад вінаў аж гнуцца сталы!

Голас:
Вялікі кароль не бывае малы!

Міністр:
Кароль, тут прышэльцы!
Вандруюць здаля...
да Нованароджанага Караля.

Гэрад:
Я — Гэрад!

Законны кароль тут адзін.
Які яшчэ Нованароджаны Сын?
Мяне выбірае і любіць народ
падрад шмат кадэнцый —
заўжды на пяць год!
Ды ладна, Міністр, прышэльцаў прасі.
Але перад тым добра іх патрасі.

*Уваходзяць* Тры Каралі.

Гэрад:
Апавядайце! Адкуль і куды?
І Нованароджаны — хто Ён такі?
Без войска, без зброі, як старцы-дзяды,
ідзеце вітаць Караля — жабракі?!

Каспар:
Ён — Збаўца, Месія! Яго Бог прыслаў.

Мельхіёр:
Імя Езус Хрыстус — Пан Бог Яму даў.

Бальтазар:
Яго прывітаць Пан Бог выбраў нас.

Гэрад:
Чаму не мяне?
Я важнейшы за вас.
Гэй, гэй, мае слугі, навукаў мужы!
Паўзіце сюды да «карыта», вужы!

*З'яўляецца* Вучоны.

Гэрад:
Дык дзе ёсць Месія? Яшчэ Ён не ўцёк?

В у ч о н ы:
А Ён ў Бэтлееме — так кажа прарок.

Г э р а д *думае, адвярнуўшы, галаву ўбок:*
Так, трэба падумаць...
Кароль — немаўля.
Заб'ю ўсіх дзяцей — і няма караля.
А гэтым вандроўнікам можна зманіць...

Г э р а д — *да гасцей:*
Як будзеце ехаць з разведкі назад,
не ўздумайце толькі дарогу змяніць.
Далажыце мне. Я прыму вас, як брат.
Малому Месію — мой нізкі паклон!
Я — добры кароль.
Я аддам Яму трон.

Г э р а д *думае ўголас, кажа, крыху адвярнуўшыся ўбок:*
Ў мяне атрымае! Хм! Бачыў дурных!
Забіць загадаю ўсіх хлопцаў малых!

*Каралі, Міністр і* В у ч о н ы *пакідаюць палац.*

Г о л а с:
Голас чуецца ў Раме,
плач і вялікі лямант,
плача Рахіль па дзецях сваіх —
як суцешыць? — няма ўжо іх...
*(Мц 2, 18).*

Г э р а д:
Я — Гэрад, прыдумаў рашаючы ход:
Знішчыць мальцаў усіх да двух год.
А з імі і гэтага Караля
Такая вось воля мая!

## У Бэтлееме. Дзея V.

З'ява перад стаенкай

Летапісец, Перапісчык. Каралі *моўчкі ідуць...*

Летапісец:
Мудрыя Тры Каралі
два тыдні ў Бэтлеем ішлі.

Перапісчык:
Ад Ерузалема сем вёрст —
калі не ў абход, а наўпрост...

З'ява ў стаенцы

Святая Ся м'я, два Анёлы і Тры Каралі.

Тры Каралі *(разам):* Хвала Хрысту!

Юзаф, Марыя:
Хвала навекі!

1-ы Анёл:
Вітаюцца ўрачыста вельмі.

Каспар:
Збаўцу вітаць ад народаў Усходу
маем такую нагоду!

Мельхіёр:
Ігонар!

Бальтазар:
І асалоду!

Т р о е  р а з а м:
Езусу Хрысту, Збаўцу, хвала!
Нас у Бэтлеем Зорка вяла.

К а с п а р:
Чыстага золата поўную кайстру
Збаўцу прыношу ў дарунак — я, Каспар.

М е л ь х і ё р:
У бутлі духмяны алей або мірра —
з горных далін я прыношу — Мельхіар!

Б а л ь т а з а р:
Я — Бальтазар! Мой дарунак — кадзіла!
У знак пакланення прымі, о, Месія!

Т р о е  р а з а м:
Хвала Табе, о Прачыстая Панна!
Гасанна! Гасанна! Гасанна!
О, Юзаф, Давідава кроў!
Пашана ад нас — Каралёў!

М а р ы я *(сама да сябе):*
Паважныя людзі з дарамі...
З якімі заходзяць у храмы...
Звароты і словы якія?
А што ж гэта значыць, Марыя?

**Песня Марыі, Маці Божай:**

Я Цябе шкадаваць хацела,
абмываць сваімі слязамі.
А Слова сталася Целам
і пасялілася паміж Намі.

Я была б Тваім ціхім ценем,
Як бываюць шчаслівыя мамы.
А Слова сталася Целам

і пасялілася паміж Намі.

Я Табе калыханку пела б,
А ўсе дні былі б нашымі днямі.
А Слова сталася Целам
і пасялілася паміж Намі.

Да Цябе Я птушкай ляцела б.
Праз агні, праз вострыя брамы
А Слова сталася Целам
і пасялілася паміж Намі...

З'ява ў стаенцы

*Усе спяць, седзячы.* Анёлы *падыходзяць да* Каралёў *і паціху ім кажуць:*

1-ы Анёл:
Каспар, Мельхіёр, Бальтазар!
Як разведчыкі з разведкі
прабірайцеся не разам.

2-і Анёл:
Вы цяпер у Бога сведкі!

1-ы Анёл:
Не выходзьце на дарогу —
там чакае войска многа.

2-і Анёл:
За пагоркам дрэмле вёска.
Але ў вёсцы поўна войска!

1-ы Анёл:
Абмініце краем горы!
Не вяртайцеся праз горад!
Пасткі ўсюды ставіць Гэрад.
Хай яго зацягне ў нерат!

www.kamunikat.org

К а р а л і *моўчкі пакідаюць сонную стаенку і разам кажуць:*
Мы не пойдзем, як ішлі.
Мы не скажам, дзе былі.
Нас не купяць за рублі.
Мы — у Бога Каралі!

З'ява ў стаенцы:
*Усе без Каралёў.*

1-ы А н ё л:
Як сцямнела навакол,
кажа Юзафу Анёл:

2-і А н ё л:
Маці, Сына забірай,
у Егіпет уцякай!
Я вас выведу ўначы,
каб ад Гэрада ўцячы.

М а р ы я *апранае* Е з у с а, *збірае ў дарогу на-бытак, спявае:*

Кую, кую ножку,
едзем у дарожку!
Не вязе нас возік,
а вязе нас вослік.
...Трэба булачку спячы
і ад Гэрада ўцячы.

В о с л і к:
Еду, еду еду,
не пакіну следу
Засыпае след пяском,
а Егіпет за ляском!

Усе:
Толькі ў Бога ёсць ключы —
як ад Гэрада ўцячы...

**Песня, якую спяваюць**
**усе ў зале:**

Нарадзіўся у стаенцы,
зразумеў людскія сэрцы.
Злыя мелі смерць, як зброю —
перамог яе любоўю.
Аж да пекла дакрануўся,
быў у пекле і вярнуўся!
Насцеж адчыніў нябёсы —
басанож ідзі, не бойся.
Езус Хрыстус спіць у сенцы.
Хто жывы — няхай прачнецца!

---

Рэлігійнае выданне
Бічэль Данута Янаўна
**НАРАДЖЭННЕ ЕЗУСА ХРЫСТА,**
**НАШАГА ЗБАЎЦЫ**
Вершаваная батлейка
Для службовага карыстання

© OCR: Камунікат.org, 2011 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год